1. На шляху станаўлення беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і прблемы / В.В. Яноўская і інш.; навук. Рэд. В.В. Яноўская; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2011.

2. Полное собрание законов Российской империи. Собрание второе: в 55 т. СПб.: Тип. II отд. Собств. Его Имп. Вел. Канцел., 1830 – 1884 гг. – Т. XV. – Отд. 1.

3. Российский государственный исторический архив в Санкт-Петербурге. – Фонд 1266. –Оп. 1. - Д. 8. Журнал Комитета западных губерний за 1831 г.

4. Российский государственный исторический архив в Санкт-Петербурге. – Фонд 1267. – Оп. 1. – Д. 2. Журнал Западного комитета за 1862 г.

## *Карбалевич Н. Н.*Лакальныя асаблівасці традыцый і абрадаў беларускага сялянства ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя

Малая радзіма – гэта не проста геаграфічнае месца. Гэта яшчэ і ўнікальныя, непаўторныя лакальныя традыцыі і звычаі, характэрныя толькі для гэтай мясцовасці. Традыцыйная культура грунтуецца на палітры разнастайных лакальных традыцый. У кожным рэгіёне, раёне, вёсцы, нават самай маленькай, можа захоўвацца ўнікальная адметная традыцыя ці абрад. Культурная адметнасць лакальных супольнасцяў беларускага сялянства з’яўляецца значным аспектам беларускай традыцыйнай культуры. Падчас працяглага сумеснага пражывання сялян утвараліся найбольш шчыльныя стасункі паміж жыхарамі канкрэтнага локуса ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. З цягам часу лакальныя абшчыны пачыналі ўяўляць сабой адзіныя культурныя сістэмы. І гэтае культурна-гаспадарчае адзінства было адной з найбольш трывалых абшчынных асаблівасцяў і найменш трапляла пад разбурэнне часам. Кожная вясковая абшчына адрознівалася ад іншых адметнасцямі сваіх лакальных традыцый і абрадаў. Гэта адлюстроўваецца ў фальклоры – «што край, то й звычай» [1, с. 95]; «што деревня, то обычай» [3, с. 15]; «што сяло, та нораў» [6, с. 121]. Праяўлялася лакальная культурная адметнасць ва ўсіх сферах жыцця грамады. І.А. Сербаў адзначаў, што сялянскія гаворкі ў розных абшчынах часта настолькі моцна адрозніваліся,

што нават жыхары суседніх абшчын пры жывой хуткай размове з цяжкасцямі разумелі адзін аднаго [5, с. XV].

Вясковая абшчына таксама вызначалася адзінствам вопраткі яе жыхароў. І.А. Сербаў апісваў гэта так: «Незвычайна маляўнічую групу складаюць часам у святочны дзень каля царквы прадстаўнікі розных абшчын, якія ўваходзяць у склад аднаго прыхода. У такой групе з яскравасцю вылучаецца на фоне агульнай масы мясцовая асаблівасць у вопратках, якая як бы кажа сама за сябе» [5, с. V]. Вельмі шчыльна лакальнай традыцыяй былі рэгламентаваныя спосабы вядзення гаспадаркі. Адам Варлыга занатаваў і патлумачыў прыказку, якая яскрава ілюструе гэты падыход: «Шый, як зложана. Гэтак прыказана, каб ня ўводзіць у жыццё навінаў і чужых звычаяў, а трэба жыць спрадвечнымі парадкамі й звычаямі свайго краю» [1, с. 96]. Існавалі і спецыфічныя лакальныя патрабаванні да выканання гаспадарчай дзейнасці. У вічынскіх палян жанчыны не бялілі палатна і не мылі вопратку, калі ў полі выспявала жыта, каб спелы колас не пабялеў і не пасох [4, с. 62].

На Гродзеншчыне селяніну нельга было пачынаць заворваць сваю зямлю чорным валом, а трэба было папрасіць суседа пазычыць яму вала з іншым колерам поўсці [7, с. 243]. Таксама кожная вёска адрознівалася асаблівасцямі сваіх абрадаў і фальклору. Адметныя характэрныя рысы ў межах вясковай грамады мелі як каляндарныя, так і сямейныя абрады. Лакальная варыятыўнасць беларускай абрадавай сістэмы ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя выяўляецца, па-першае, у наяўнасці рэгіянальных абрадаў, характэрных толькі для пэўнага рэгіёну. Напрыклад, абрад ваджэння «куста» на Тройцу ў Заходнім Палессі [7, с. 171], [8, с. 229] ці стаўбавы абрад падчас вяселля ў паўночна-ўсходняй Беларусі [8, с. 206]. Па-другое, для беларускай традыцыйнай культуры характэрныя лакальныя варыяцыі абрадаў, распаўсюджаных па ўсёй Беларусі.

Прычым, адрозненні маглі існаваць нават у суседніх локусах. Так, паводле І.А. Сербава, на Палессі абрадавыя адрозненні паміж грамадамі, з якіх паходзілі жаніх і нявеста, падчас вяселля маглі быць настолькі значнымі, што да кампраміснага варыянту святкавання вяселля прыходзілі толькі пасля працяглых спрэчак [5, с. IX]. Ці, напрыклад, у матэрыялах А.С. Дэмбавецкага, апісваецца, адзін з каляндарных абрадаў, калі на другі дзень Калядаў адбываліся ўзаемныя візіты і частаванні паміж бабкай-пупарэзніцай і яе названымі ўнукамі, можна звярнуць увагу не толькі на асаблівасці гэтага абра-

ду ў розных вёсках аднаго павету, але і нават на адрозныя яго назвы – так. Канічы Клімавіцкага павету гэты абрад меў назву «бабіны», а ўжо ў с. Забялышын таго ж павета называўся «маладзёны» і здзяйсняўся інакш [2, с. 522].

Таксама амаль кожная грамада акрамя выканання каляндарных і сямейных абрадаў, мела сваё вясковае свята – «хвэст», святкаванне якога традыцыйна мела лакальныя асаблівасці ў кожнай вёсцы [6, с. 142]. Амаль кожная вясковая сялянская абшчына беларусаў у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя характарызавалася адметнасцю лакальных традыцый і абрадаў. У наш час глабалізацыі, калі адбываецца ўніфікацыя нацыянальных культур у сусветным маштабе, асаблівае значэнне набывае захаванне лакальных традыцый – гэтых перлінаў народнай культуры, што з’яўляюцца вынікам унікальнасці мыслення лакальнай супольнасці людзей і прыводзяць нас да гуманістычнага ідэалу самакаштоўнасці чалавека. Вылучэнне адметных этнаграфічных рысаў грамадскіх традыцый і абрадаў лакальных вясковых супольнасцяў беларусаў узбагачае нацыянальную культуру, дапамагае беларусам абгрунтаваць сваю этнічную адметнасць і далучанасць да сусветных культурных працэсаў.

Літаратура

1. Варлыга, А. Прыказкі Лагойшчыны / А. Варлыга. – Нью-Ёрк, Мюнхен, 1966.

2. Дембовецкий, А.С. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях в 3 кн. / А.С. Дембовецкий. – Могилев, 1882. – Кн. 1.

3. Крачковский, Юл.Ф. Быт западнорусского селянина / Юл.Ф. Крачковский. – М., 1874.

4. Сербаў, І.А. Вічынскія паляне: матэрыял. культура: этнаграфічны нарыс Беларускага Палесся / І.А. Сербаў; прадм. Т.А. Навагродскі, Я.А. Пясоцкая. – Мінск, 2005.

5. Сербов, И.А. Белорусы-сакуны. Краткий этнографический очерк / И.А. Сербов. – Петроград, 1915.

6. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў /А.К. Сержпутоўскі; навук. рэд. А.С. Фядосік; прадм. У.К. Касько; маст. В.Р. Мішчанка. – Мінск, 1998.

7. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб.: Типография Императорской Академии наук, 1902. – Том III.– IV.
8. Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэб.-метад. дапам. / Т.А. Навагродскі [і інш.]. – Мінск, 2009.

## 2 ДИАЛОГ КУЛЬТУР В ГОД МАЛОЙ РОДИНЫ

### *Сергиевич Т. В.* **Мода и экономическая культура**

Усложнение связей и отношений в современном обществе, теоретическое отражение происходящих процессов в концепте трансэкономики требуют осмысления явлений, не обладающих чисто экономической природой, одним из которых является мода.
Взаимообусловленность феноменов культуры и экономической системы общества очевидна. В контексте настоящего исследования нами принимается подход к определению культуры В.С. Степина, разделяемый С. Ю. Солодовниковым [1], в рамках которого под культурой понимается «система исторически развивающихся надбиологических программ человеческой деятельности, поведения и общения, выступающих условием воспроизводства и изменения социальной жизни во всех ее основных проявлениях. Программы деятельности, поведения и общения, составляющие корпус культуры, представлены разнообразием различных форм: знаний, навыков, норм и идеалов, образцов деятельности и поведения, идей и гипотез, верований, социальных целей и ценностных ориентаций. В своей совокупности и динамике они образуют исторически накапливаемый социальный опыт. Культура хранит, транслирует (передает от поколения к поколению) и генерирует программы деятельности, поведения и общения людей. В жизни общества они играют примерно ту же роль, что и наследственная информация (ДНК, РНК) в клетке или сложном организме; они обеспечивают воспроизводство многообразия форм социальной жизни, видов деятельности, характерных для определенного типа общества, присущей ему природной среды..., его социальных связей и типов личности – всего, что составляет реальную ткань социальной жизни на определенном этапе ее исторического развития» [2, с. 524]. При таком понимании культуры очевидна ее взаимосвязь с экономической систе-